Квітней, наш школьны сад!

Вось і скончыліся апошнія бесклапотныя летнія канікулы. Наперадзе апошні год навучання ў школе, экзамены, пступленне ў навучальную ўстанову. З нецярплівасцю чакала сустрэчы пасля адпачынку з сябрамі, аднакласнікамі, настаўнікамі і са школьным садам. Так, так, я не памылілася, калі пішу гэтыя радкі. Мая любоў узнікла з першага дня паступлення ў нашу школу. Мяне ўразіў сад сваёй велічнасцю, прыгажосцю, ціхай задумленнасцю. У розныя поры года сад мае свае адметнасці і непаўторнасць. Вясною дрэвы хочацца параўнаць з цнатліваю нявестаю ў багатым белым убранні, летам — з сакавітай жанчынаю ў пару свайго сталення, восенню — з багатай заможнай гаспадыняй, а зімою — са спрацаванай спадарыняй, якая годна адпачывае пасля нялёгкай і плённай працы.

Наш сад мае багатую гісторыю і традыцыі. У гэтым годзе яму вясною споўнілася 60 год. А гэта вельмі паважны і сталы юбілей. Закладзены сад быў у 1956 годзе былымі вучнямі і настаўнікамі нашай школы. Было пасаджана ў той час 160 дрэўцаў яблынь розных гатункаў. Гэта і антонаўка, і залаты ранет, і каштэля, і папінка, і белы наліў. Сёння сад налічвае 157 пладовых дрэў. Разам з садам быў створаны гурток "Юных садаводаў", у якім вучні вялі значную даследчую работу. З таго часу былі закладзены многія традыцыі, якія працягваем і мы ў наш час.

Работы пачынаюцца ранняй вясною, калі зямля толькі пачынае адыходзіць ад зімовага зняволення. Усе вучні дружна выходзяць зграбаць смецце, якое нанясла зімовая непагадзь. Калі глеба добра адыдзе ад марозу, вучні 5-ых — 11-ых класаў абкопваюць прыствольныя кругі дрэў і беляць іх. На ўроках працы хлопцы майструюць новыя шпакоўні вясною і кармушкі для птушак зімою. Удзел прымаюць усе вучні школы, пачынаючы ад малодшых да старэйшых. Летам таксама хапае работы. Працоўны атрад пры школе і дзеці, якія праходзяць школьную практыку змагаюцца са шкоднікамі саду, збіраюць падаліцу, падтрымліваюць чысціню. А восенню сад з удзячнасцю за ўсе клопаты аддае свой багаты ўраджай. У гэтым годзе мы здалі нарыхтоўшчыкам каля 10 тон яблык. Хапае паласавацца і дзецям, і работнікам школы. А позняй восенню мы будзем рыхтаваць нашы дрэвы да зімоўкі: зграбаць апалае лісце, каб зімою сад адпачыў і назапасіў сіл для новага ўраджаю. Усе гэтыя мерапрыемствы праходзяць у межах акцыі "Наш школьны двор".

Сад, канешне, мае сталы ўзрост. Але мы робім усё, каб ён працягваў сваё жыццё. Таму што гэта сімвал пераемнасці і еднасці некалькіх пакаленняў, якія вучыліся ў нашай школе. Гэта гонар і адметнасць СШ №1 г. п. Рось.

# Повязь пакаленняў











Аддзел адукацыі, спорту і турызму

Ваўкавыскага райвыканкама

Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа №1 г.п. Рось”

# Квітней, наш школьны сад!

Аўтар: Дзенісюк Анастасія Ігараўна

(11 клас)

Кіраўнік: Польцына Алена Мікалаеўна

настаўнік беларускай мовы і літаратуры

тэл.(029) 285-01-35

Рось, 2016